Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар Беларускага
дзяржаўнага універсітэта
культуры і мастацтваў
______________ Ю.П.Бондар
“____”______________2009 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/баз

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА

*Праграма да дзяржаўных экзаменаў па спецыяльнасці*
*23 01 11 бібліятэказнаўства і бібліяграфія спецыялізацыя*
*23 01 11 – 04 01 беларуская мова і літаратура*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2009

**Складальнікі:**

*В.А.Гуліцкая,* кандыдат філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў";

*А.М.Пісарэнка,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў";

*Г.К.Тычко,* доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

**Рэцэнзенты:**

*Г.Я.Адамовіч,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры беларускай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка";

*В.М.Бігеза,* кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў"

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 6 ад 23. 02. 2009 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 5 ад 10.03.2009 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# УСТУП

Праграма да дзяржаўнага экзамену пабудавана з улікам канцэптуальнага навуковага падыходу да разумення гісторыі развіцця нацыянальнай мовы і літаратуры і адпавядае агульнаадукацыйным стандартам па беларускай мове і літаратуры для студэнтаў спецыялізацыі “бібліятэказнаўства і бібліяграфія, беларуская мова і літаратура”. *Мэта курса* – праверыць веды выпускнікоў па філалагічных дысцыплінах, выявіць уменні і навыкі ў розных відах маўленчай дзейнасці, іх падрыхтаванасць да самастойнага аналізу мастацкага твора і творчасці пісьменніка з улікам характарыстыкі эпохі і асноўных этапаў яе развіцця, а таксама трываласць засваення нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

Для выяўлення навуковага лінгвістычнага ўзроўню студэнтаў-выпускнікоў, іх здольнасці да працы ў школе ў праграму ўнесены пытанні з розных навучальных курсаў: “Старaславянскай мовы”, “Гістарычнай граматыкі беларускай мовы”, “Гісторыі беларускай літаратурнай мовы”, “Агульнага мовазнаўства”, “Культуры мовы і стылістыкі”, “Беларускай дыялекталогіі”. Паколькі “Сучасная беларуская літаратурная мова” займае цэнтральнае месца ў сістэме лінгвістычнай падрыхтоўкі выкладчыка мовы і літаратуры і з’яўляецца аб’ектам вывучэння ў агульнаадукацыйных школах і гімназіях, таму большасць пытанняў у праграме дзяржаўнага экзамену – па гэтым курсе.

Сучасная беларуская мова і літаратура – асноўныя дысцыпліны, засваенне якіх неабходна для плённай працы настаўнікаў-філолагаў. Гэтая акалічнасць патрабуе ад студэнтаў сістэматычнага засваення найбольш значнага і самага актуальнага для будучай працы навуковага матэрыялу, глыбокага яго асэнсавання і свабоднага прымянення ў выкладчыцкай дзейнасці.

У канцы праграмы даецца рэкамендацыйны спіс літаратуры па кожнай філалагічнай дысцыпліне, што дапаможа студэнтам знайсці адказ на пастаўленыя пытанні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЧАСТКА І. БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## Тэма 1. Беларуская мова – нацыянальная мова беларускага народа

Мова – духоўны скарб народа. Беларуская мова сярод іншых моў свету, гістарычныя ўмовы і этапы яе развіцця. Асаблівасці ўтварэння і станаўлення беларускай літаратурнай мовы: старабеларуская літаратурная мова і яе разнастайныя грамадскія функцыі; новая беларуская літаратурная мова “як маці славянскай сям’і моваў”. Сучасная беларуская літаратурная мова, яе вусная і пісьмовая формы. Беларускія пісьменнікі пра беларускую мову.

## Тэма 2. Асаблівасці фанетыкі сучаснай беларускай мовы

Фанетычная сістэма беларускай мовы. Гук як найменшая адзінка мовы. Галосныя гукі, іх артыкуляцыйная класіфікацыя. Функцыянальны аспект гукаў. Гістарычная абумоўленасць законаў спалучэння гукаў. Змены галосных. Моцная і слабая пазіцыі галосных гукаў. Аканне (яканне) у беларускай мове. Прыстаўныя і ўстаўныя галосныя.

Агульная характарыстыка спосабаў класіфікацыі зычных гукаў. Змены і чаргаванні зычных. Дзеканне і цеканне. Асіміляцыя і дысіміляцыя. Фанетычнае падаўжэнне зычных і яго адрозненне ад марфалагічнага падваення. Прыстаўныя зычныя гукі і інш.

Прасадычныя сродкі мовы (націск, інтанацыя). Склад. Прынцыпы складападзелу.

## Тэма 3. Арфаэпія – сукупнасць нормаў беларускага літаратурнага вымаўлення

Асноўныя арфаэпічныя нормы і культура маўлення. Фарміраванне беларускага літаратурнага вымаўлення. Вымаўленне націскных і ненаціскных галосных. Вымаўленне зычных і спалучэнняў зычных (у моцных і слабых пазіцыях). Арфаэпічныя нормы, прычыны адхілення ад іх.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 4. Фарміраванне графічнай сістэмы беларускай мовы

Беларуская графіка. Звесткі з гісторыі беларускай графікі. Лацініца і кірыліца – аснова графікі ўсходнеславянскіх моў. Удасканаленне шрыфту беларускім першадрукаром Ф.Скарынам. Паралельнае выкарыстанне ў кнігадрукаванні кірыліцы і лацінкі ў пачатку ХХ стагоддзя. Выкарыстанне на Беларусі арабскага пісьма. Алфавіт і нялітарныя графічныя сродкі. Асноўныя прынцыпы беларускай графікі.

## Тэма 5. Прынцыпы беларускай арфаграфіі

З гісторыі беларускай арфаграфіі. Напісанні, заснаваныя на фанетычным і марфалагічным прынцыпах правапісу. Змены і спрашчэнні беларускага правапісу ў 1933 г. Удакладненні і частковыя змены беларускага правапісу ў 1957 г. “Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (1959), іх значэнне ў далейшай нармалізацыі беларускага правапісу і пунктуацыі. Закон аб мовах (1990). Увядзенне ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь “Аб Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі” (2008). Роля нарматыўнай граматыкі і слоўнікаў беларускай літаратурнай мовы ў фарміраванні адзінай арфаграфічнай культуры.

## Тэма 6. Слова як адзінка мовы. Асноўныя тыпы лексічных значэнняў слова

Лексікалогія як раздзел мовазнаўства. Паняцце пра слова. Лексічнае і граматычнае значэнні слова. Асноўныя тыпы лексічных значэнняў слова. Шляхі змянення значэнняў слоў: манасемія, полісемія, метафара, метанімія, сінекдаха, іх тыпы і функцыі ў мове.

Лексіка-семантычныя групы слоў. Аманімія і сумежныя з’явы. Лексічныя і лексіка-граматычныя амонімы. Міжмоўныя амонімы і паронімы, іх стылістычнае выкарыстанне. З’ява сінаніміі ў мове. Віды сінонімаў і шляхі іх узнікнення. Стылістычная роля сінонімаў, іх функцыя ў мове. Антанімія і яе сувязь з мнагазначнасцю. Рознакаранёвыя і аднакаранёвыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антонімы. Кантэкстуальныя антонімы. Аксюмаран і антытэза. Стылістычнае выкарыстанне антонімаў.

## Тэма 7. Лексіка сучаснай беларускай мовы паводле паходжання

Спрадвечна беларуская і запазычаная лексіка. Гістарычныя пласты спрадвечна беларускай лексікі: агульнаславянская, усходнеславянская лексіка і ўласнабеларускія словы. Запазычаныя словы ў беларускай мове, іх прыметы. Інтэрнацыянальная лексіка. Семантычнае, фанетычнае і марфалагічнае асваенне запазычаных слоў. Калькі, іх выкарыстанне ў мове.

## Тэма 8. Лексіка беларускай мовы паводле сферы яе выкарыстання

Агульнаўжывальная лексіка і лексіка абмежаванага выкарыстання. Дыялектная лексіка. Дыялектызмы і іх тыпы. Спецыяльная лексіка (тэрміналагічная і прафесійная). Жаргонныя словы. Стылістычнае выкарыстанне лексікі абмежаванага ўжытку ў мове.

Дыферэнцыяцыя лексікі паводле актыўнага і пасіўнага складу. Актыўная лексіка. Пасіўная лексіка: гістарызмы, архаізмы, неалагізмы. Шляхі ўзнікнення неалагізмаў, іх разнавіднасці (лексічныя і семантычныя; індывідуальна-аўтарскія неалагізмы) і роля ў мове.

## Тэма 9. Беларуская фразеалогія і фразеаграфія

Фразеалогія як раздзел мовазнаўства. Фразеалагізм як адзінка мовы, яго асноўныя асаблівасці. Варыянтнасць фразеалагічных адзінак, іх мнагазначнасць, сінанімічнасць і аманімічнасць. Класіфікацыя фразеалагізмаў. Крыніцы беларускай фразеалогіі. Стылістычнае выкарыстанне фразеалагізмаў і афарыстычных выслоўяў у мове мастацкіх твораў.

Фразеаграфія як раздзел мовазнаўства. Беларускія фразеалагічныя слоўнікі. Будова фразеалагічнага артыкула. З гісторыі беларускай фразеаграфіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 10. Беларуская лексікаграфія

Лексікаграфія як раздзел мовазнаўства. Энцыклапедычныя і лінгвістычныя (філалагічныя) слоўнікі (даведнікі). Тыпы лінгвістычных слоўнікаў. Будова слоўнікавага артыкула ў энцыклапедыях і лінгвістычных слоўніках. Сістэма граматычных і стылістычных памет. Тыпы дэфініцый у тлумачальных слоўніках. Беларускія энцыклапедычныя выданні (універсальныя, галіновыя і персанальныя).

## Тэма 11. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў і іх класіфікацыя

Вучэнне пра часціны мовы. Прынцыпы вылучэння і размежавання часцін мовы на аснове іх лексічнага значэння, марфалагічных адзнак, асаблівасцей словаўтварэння і сінтаксічнай функцыі. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Пытанне класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры. Пераход слоў з адной часціны мовы ў другую.

## Тэма 12. Марфеміка як раздзел мовазнаўства

Паняцце марфемы. Відазмяненні марфемы. Аснова слова і канчатак. Корань і афіксы. Змены ў марфемнай будове слова. Марфемны і словаўтваральны аналіз слова.

## Тэма 13. Лексіка-граматычная і функцыянальная характарыстыка назоўніка

Назоўнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля. Лексіка-граматычныя групы назоўнікаў. Граматычныя катэгорыі назоўніка: род, лік, склон. Катэгорыя роду назоўніка. Вызначэнне роду паводле лексічных і граматычных прымет. Вызначэнне роду запазычаных нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур. Катэгорыя ліку назоўніка, яе граматычнае выражэнне. Склон назоўнікаў. Асноўныя значэнні склонаў у сучаснай беларускай мове. Стылістычныя магчымасці назоўнікаў.

Сістэма скланення назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Тыпы скланення назоўнікаў. Асаблівасці склонавых канчат-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каў назоўнікаў першага скланення. Назоўнікі другога скланення і іх канчаткі. Трэцяе скланенне назоўнікаў. Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Рознаскланяльныя і нескланяльныя назоўнікі. Скланенне прозвішчаў і геаграфічных назваў.

Сучасная тыпалогія скланення назоўнікаў і яе адносіны да старажытных тыпаў іменнага скланення.

## Тэма 14. Лексіка-граматычная і функцыянальная характарыстыка прыметніка

Прыметнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля і граматычныя катэгорыі. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў, іх формы і выкарыстанне ў сучаснай беларускай мове. Поўныя, кароткія і сцягнутыя (усечаныя) формы якасных прыметнікаў. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Скланенне прыметнікаў. Формы суб'ектыўнай ацэнкі і непаўнаты якасці. Утварэнне прыметнікаў.

## Тэма 15. Лексіка-граматычная і функцыянальная характарыстыка лічэбнікаў

Лічэбнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады і структура лічэбнікаў. Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. Скланенне лічэбнікаў. Пераход лічэбнікаў у іншыя часціны мовы. Няпэўна-колькасныя словы. Роля лічэбнікаў у мове.

## Тэма 16. Граматычная і функцыянальная характарыстыка займеннікаў

Займеннік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Групы займеннікаў паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы. Разрады займеннікаў паводле значэння і іх лексіка-граматычная характарыстыка. Скланенне займеннікаў. Тыповыя памылкі ў выкарыстанні займеннікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 17. Лексіка-граматычная адметнасць дзеяслова

Дзеяслоў як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Граматычныя катэгорыі дзеяслова. Сістэма дзеяслоўных формаў: спрагальныя і неспрагальныя, зменныя і нязменныя формы. Асновы дзеяслова. Пераходныя і непераходныя дзеясловы. Зваротныя дзеясловы. Безасабовыя дзеясловы, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці. Спражэнне дзеясловаў. Стылістычныя магчымасці дзеясловаў.

Дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе як своеасаблівыя формы дзеяслова. Дзеепрыметнік і яго дзеяслоўныя прыметы (катэгорыі стану, трывання, часу; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыметнікаў ад дзеяслоўных асноў). Адзнакі прыметніка (род, лік, склон). Сінтаксічная роля дзеепрыметніка. Поўныя і кароткія дзеепрыметнікі. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Моўныя сродкі для замены пры перакладзе неўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў. Дзеяслоўныя, прыслоўныя прыметы дзеепрыслоўя. Утварэнне дзеепрыслоўяў закончанага і незакончанага трывання. Ужыванне дзеепрыслоўяў у мове.

## Тэма 18. Лексіка-граматычная і функцыянальная характарыстыка прыслоўя

Прыслоўе як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля. Разрады прыслоўяў паводле значэння. Ступені параўнання якасных прыслоўяў. Утварэнне прыслоўяў ад розных часцін мовы. Формы суб’ектыўнай ацэнкі і непаўнаты якасці якасных прыслоўяў. Безасабова-прэдыкатыўныя словы, іх лексічнае значэнне, марфалагічныя катэгорыі і сінтаксічная функцыя. Мэтазгоднасць вылучэння безасабова-прэдыкатыўных слоў як самастойнай часціны мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 19. Структура, асноўнае граматычнае значэнне і правапіс службовых часцін мовы

Прыназоўнік як службовая часціна мовы, яго функцыя, утварэнне і ўжыванне. Сінаніміка прыназоўнікаў. Злучнік як службовая часціна мовы. Разрады злучнікаў паводле паходжання, структуры, ужывання і сінтаксічнай функцыі. Злучальныя словы, іх адрозненне ад злучнікаў. Часціца як службовая часціна мовы. Разрады часціц і іх правапіс. Семантыка мадальных слоў і іх суадноснасць са словамі іншых часцін мовы. Разрады выклічнікаў. Гукапераймальныя словы, іх адрозненне ад выклічнікаў.

## Тэма 20. Словазлучэнне і сказ – асноўныя сінтаксічныя адзінкі

Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Класіфікацыя словазлучэнняў паводле: а) структуры і ўстойлівасці сувязі кампанентаў; б) асноўнага слова; в) сэнсавых адносін. Віды сінтаксічнай сувязі слоў і сродкі яе выражэння. Адметнасць беларускіх словазлучэнняў.

Сказ як сінтаксічная адзінка. Асноўныя адзнакі сказа. Адрозненне сказа ад слова і словазлучэння.

## Тэма 21. Сказ як камунікатыўная і прэдыкатыўная адзінка сінтаксісу

Тыпы сказаў паводле: а) мэты выказвання; б) адносін выказвання да рэчаіснасці; в) граматычнай структуры. Просты сказ і яго граматычныя адзнакі. Дзейнік і яго структурна-граматычнае выражэнне. Выказнік і яго тыпы. Каардынацыя выказніка з дзейнікам. Віды, структура і змест аднасастаўных сказаў. Дададзеныя члены сказа, іх тыпы і спосабы выражэння. Поўныя і няпоўныя сказы. Эліптычныя сказы. Словы-сказы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 22. Ускладнены сказ і яго адметныя адзнакі на ўзроўні сінтаксічных пазіцый, сінтаксічных адносін, сінтаксічных сувязей

Сказы з аднароднымі галоўнымі і даданымі членамі. Абагульняльныя словы пры аднародных членах сказа і знакі прыпынку пры іх. Сказы з адасобленымі членамі. Сказы з параўнальнымі зваротамі, іх змест і пунктуацыя. Пабочныя і ўстаўныя канструкцыі, адрозненні паміж імі, знакі прыпынку пры іх. Зваротак, яго выражэнне, знакі прыпынку пры ім.

## Тэма 23. Складаныя сказы, структура, тыпы і віды сувязі ў іх

Агульная характарыстыка складаназлучанага сказа. Сувязь частак у складаназлучаным сказе пры дапамозе злучальных злучнікаў. Выражэнне розных сэнсавых адносін паміж часткамі складаназлучанага сказа. Складаназалежны сказ і сродкі сувязі даданай часткі з галоўнай. Тыпы даданых частак (сказаў). Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі. Сузалежнае і паслядоўнае падпарадкаванне. Бяззлучнікавы складаны сказ, яго характарыстыка і пунктуацыя. Складаны сказ з рознымі відамі сувязі (камбінаваны), яго структура і сродкі сувязі. Чужая мова і спосабы яе перадачы. Цытаты, іх афармленне і функцыі.

## Тэма 24. Мова як сродак камунікацыі. Паходжанне, развіццё, функцыі мовы

Прырода і сутнасць мовы. Функцыі мовы. Паняцце пра метамову. Мова і грамадства. Мова і мысленне. Мова і маўленне. Паняцце пра сістэму і структуру мовы. Раздзелы мовазнаўства.

Асноўныя віды класіфікацыі моў свету (генеалагічная, марфалагічная, арэальная, функцыянальная). Спосабы (сродкі) выражэння граматычных значэнняў у мовах свету: сінтэтычны і аналітычны. Паняцце пра сінтэтычны і аналітычны лад мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 25. Фанетычныя змяненні пісьмовай эпохі

Фанетычныя змяненні пісьмовага перыяду ў вакалізме і кансанантызме ўсходнеславянскай мовы-асновы, іх лёс у сучаснай беларускай літаратурнай мове:

– бегласць галосных, выраўноўванне асноў, прыстаўныя галосныя, устаўныя, падаўжэнне галосных ***о, э (е)*** у новым закрытым складзе, чаргаванне ***ро:ры, ло:лы, ле:лі***, другое поўнагалоссе;

– узнікненне новых груп зычных, спрашчэнне груп зычных, страта канцавога ***л***, замена зычнага ***j*** (ётам), змяненне ***в*** на ***ў***, змяненне цвёрдага ***л*** на ***ў***, зацвярдзенне губных перад зычнымі і на канцы слоў, асіміляцыя ў новых групах зычных, з'явы прыпадабнення (цвёрдых зычных да мяккіх, свісцячых зычных да шыпячых, шыпячых зычных да свісцячых, звонкіх зычных да глухіх, глухіх зычных да звонкіх, прыпадабненне ў спалучэнні ***дн***, зліццё свісцячых ***сс→с, зс→с, цс→ц***, узнікненне падоўжаных зычных; дысіміляцыя ў новых групах зычных; змяненне звонкіх зычных на канцы слова.

## Тэма 26. Асаблівасці і этапы кадыфікацыі беларускай літаратурнай мовы

Агляд філалагічных прац і ўмоў развіцця пісьменства на беларускай мове XVI–XVIII стст. Першыя буквары, граматыкі і слоўнікі на Беларусі, іх роля.

Функцыянаванне беларускай мовы на рубяжы XIX–XX стст. на матэрыяле тэкстаў "Нашай нівы", твораў Я.Купалы, Я.Коласа.

Кадыфікацыя беларускай літаратурнай мовы 1918–1933 год. Развіццё нацыянальнай тэрмінасістэмы, лексікалогіі і ідэаматыкі.

## Тэма 27. Сучасная групоўка беларускіх дыялектаў

Дыялектная і літаратурная мовы – дзве формы існавання нацыянальнай мовы. Звесткі з гісторыі фарміравання беларускіх тэрытарыяльных дыялектаў. Групоўка беларускіх га-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ворак на аснове матэрыялаў “Дыялекталагічнага атласа беларускай мовы”.

Фанетычныя, марфалагічныя і лексічныя рысы паўднёва-заходняга і паўночна-ўсходняга дыялектаў беларускай мовы. Сярэднебеларускія і палескія гаворкі, тэрыторыя пашырэння і іх моўныя асаблівасці. Роля беларускіх гаворак у фарміраванні сучаснай беларускай літаратурнай мовы.

### Тэма 28. Культура прафесійнага маўлення

Норма і яе кадыфікацыя. Гістарычная зменлівасць і рухомасць моўных нормаў. Прычыны парушэння літаратурных нормаў (аб’ектыўныя і суб’ектыўныя). Камунікатыўныя якасці маўлення (правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, выразнасць, чысціня, багацце, дарэчнасць, сціслась), умовы іх рэалізацыі ў кантэксце функцыянальных стыляў.

Культура маўлення чалавека як адзін з галоўных паказчыкаў яго агульнай культуры.

### Тэма 29. Сістэма функцыянальных стыляў мовы

Паняцце стыляў мовы. Агульная характарыстыка функцыянальных стыляў мовы. Афіцыйна-справавы стыль і яго жанры. Жанравая спецыфіка навуковага стылю. Жанравая спецыфіка і функцыянальная адкрытасць публіцыстычнага стылю. Гутарковы стыль. Размоўна-прафесійнае і размоўна-бытавое маўленне. Мастацкі стыль і яго жанравыя разнавіднасці. Адзінства камунікатыўнай і эстэтычнай функцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА


1. *Беларуская* граматыка: у 2 ч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1. – 431 с.

2. *Беларуская* граматыка: у 2 ч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – Ч. 2: Сінтаксіс. – 327 с.

3. *Беларуская* мова: цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / А.І.Падлужны, Л.Ц.Выгонная, Г.К.Усціновіч [і інш.]. – Мн.: Народная асвета, 1987. – 144 с.

4. *Блінава, Э.Д.* Беларуская дыялекталогія / Э.Д.Блінава, Е.С.Мяцельская. – 2-е выд. – Мн.: Вышэйш. шк., 1980. – 304 с.

5. *Бурак, Л.І.* Пунктуацыя беларускай мовы / Л.І.Бурак. – 3-е выд. – Мн.: Універсітэцкае, 1982. – 208 с.

6. *Лексікалогія* сучаснай беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. А.Я.Баханькова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1994. – 463 с.

7. *Сучасная* беларуская літаратурная мова: лексікалогія. Фанетыка. Арфаграфія / М.Ц.Кавалёва, А.К.Юрэвіч, Ф.М.Янкоўскі [і інш.]. – 3-е выд. – Мн.: Вышэйш. шк., 1993. – 206 с.

8. *Сучасная* беларуская літаратурная мова: марфалогія / Н.В.Гаўрош, М.Ц.Кавалёва, Н.М.Нямковіч [і інш.]. – 2-е выд. – Мн.: Ул.М.Скакун, 1997. – 273 с.

9. *Сямешка, Л.І.* Курс беларускай мовы / Л.І.Сямешка, І.Р.Шкраба, З.І.Бадзевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.

10. *Шуба, П.П.* Сучасная беларуская мова. Марфалогія. Марфаналогія / П.П.Шуба. – Мн.: Універсітэцкае, 1987. – 334 с.

11. *Юрэвіч, А.К.* Стылістыка беларускай мовы / А.К.Юрэвіч. – 2-е выд. – Мн.: Вышэйш. шк., 1992. – 254 с.

12. *Шакун, Л.М.* Гісторыя беларускай літаратурнай мовы / Л.М.Шакун. – Мн.: Універсітэцкае, 1984. – 335 с.

13. *Янкоўскі, Ф.М.* Гістарычная граматыка беларускай мовы / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Вышэйш. шк., 1989. – 301 с.

14. *Янкоўскі, Ф.М.* Сучасная беларуская мова / Ф.М.Янкоўскі. – Мн.: Вышэйш. шк., 1984. – 176 с.

15. *Яўневіч, М.С.* Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М.С.Яўневіч, П.У.Сцяцко. – 3-е выд.– Мн.: Аверсэв, 2006. – 286 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЧАСТКА II. БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

## Тэма 1. Перыядызацыя і характарыстыка асноўных літаратурных эпох і этапаў развіцця беларускай літаратуры

*Літаратура Старажытнай (Кіеўскай) Русі.* Летапісны звод "Аповесць мінулых гадоў" XII ст. Значэнне хрышчэння Русі (988). "Слова аб палку Ігаравым" (XII ст.). Вобраз полацкага князя Усяслава Чарадзея і яго блізкасць да казачнага народнага эпасу. Зварот М.Багдановіча да "Слова" ("Песня пра князя Усяслава Полацкага"). *Літаратура эпохі Адраджэння і эпохі Асветніцтва*. Спецыфіка Рэнесансу ў Беларусі. *Літаратура рамантызму*. Грамадска-палітычныя падзеі XIX ст. у Беларусі. Вынікі ўключэння Беларусі ў склад Расійскай імперыі пасля III падзелу Рэчы Паспалітай. *Літаратура нацыянальнага адраджэння.* Францішак Багушэвіч і яго пасля-доўнікі. Асноўныя этапы развіцця літаратуры XX ст.

## Тэма 2. Дзейнасць Францыска Скарыны ў кантэксце еўрапейскага Рэнесансу

Старонкі жыцця і дзейнасці (каля 1480, Полацк – каля 1551 гг., Прага). Асветніцкая дзейнасць Скарыны. Погляды Скарыны на асвету і навуку. Прадмоўі і пасляслоўі Скарыны да выдадзеных кніг. Патрыятызм Скарыны. Наватарства Скарыны-друкара. Гісторыка-культурнае значэнне постаці Ф.Скарыны. Вобраз Скарыны ў мастацтве, музыцы, літаратуры (М.Багдановіч "Безнадзейнасць", М.Арочка "Судны дзень Скарыны", У.Караткевіч "Францыск Скарына і яго час", А.Петрашкевіч "Напісанае застаецца"). Скарынінскія традыцыі ў культурна-асветніцкай дзейнасці Сымона Буднага (каля 1530–1593 гг.) і Васіля Цяпінскага (каля 1540 – каля 1603 гг.).

## Тэма 3. Лацінамоўная паэзія Беларусі

*Мікола Гусоўскі (1480(?) – пасля 1533).* Мікола Гусоўскі – паэт-гуманіст. "Песня пра зубра" (1523) – маштабнасць і агульначалавечае значэнне твора, нацыянальна-беларускі ка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ларыт. Сімвалічнае значэнне вобраза зубра. Увасабленне рэнесансных ідэй у вобразе князя Вітаўта. Фальклорныя сродкі ў паэме і іх паэтычныя функцыі. Вобраз пушчы ў творы. Высокая аўтарская ацэнка дзейнасці князя. Вобраз Гусоўскага ў творах У.Арлова “Час чумы”, “Місія папскага нунцыя”, вершы А.Пісьмянкова “Дума Вітаўта”. *Ян Вісліцкі (каля 1485–пасля 1520)* і яго літаратурная спадчына. Паэма “Пруская вайна”. Апісанне Грунвальдскай бітвы ў творы. Універсалізм культуры эпохі Адраджэння.

## Тэма 4. Польска-беларускія пісьменнікі XIX ст.

Роля філаматскага руху, польскай рамантычнай паэзіі ў станаўленні новай беларускай літаратуры. Гістарычная абумоўленасць літаратурнага двухмоўя. *Ян Чачот (1796–1847)* – асоба і творца. Гуманістычны пафас, дэмакратычная накіраванасць і культурна-асветніцкае значэнне яго творчай дзейнасці (“Да мілых мужычкоў”, “На прыезд Адама Міцкевіча”, балады “Свізяць”, “Наваградскі замак”). *Адам Міцкевіч (1798–1855)*. Выкарыстанне беларускага фальклору ў зборніку “Балады і рамансы” (балады “Свіцязь”, “Рыбка” і інш.). Прывабны вобраз рамантычнага героя-змагара за шчасце і свабоду Літвы-Беларусі (“Ода да маладосці”, “Паэма філарэтаў”, паэма “Мешка, князь Наваградка”). Пераклады твораў А.Міцкевіча на беларускую мову.

## Тэма 5. Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч (1807–1884)

Гуманістычны пафас ранніх твораў В.Дуніна-Марцінкевіча. (“Сялянка” (1846)). Вершаваныя аповесці “Вечарніцы”, “Купала”, “Гапон” (1859). Рамантычны этнаграфізм як аснова творчага метаду В.Дуніна-Марцінкевіча. Паглыбленне крытычных элементаў у баладзе “Травіца брат-сястрыца” і вершаваных аповесцях: “Быліцы, расказы Навума” і “Халімон на каранацыі”. Драматургічная спадчына В.Дуніна-Марцінкевіча. Сатырычна-выкрывальны пафас “Пінскай шляхты” (1866) і “Залётаў” (1870). Кручкоў і Пісулькін як увасабленне чыноўнага самавольства пасля паўстання 1863 г. Ліра-эпічныя творы В.Дуніна-Марцінкевіча на польскай мове (“Славяне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ў XIX стагоддзі”, “Люцынка, альбо шведы на Літве”, “Літаратурныя клопаты”), іх гісторыка-мастацкае значэнне.

## Тэма 6. Францішак Багушэвіч (1840–1900)

Уплыў паўстання 1863 г. на фарміраванне ідэйна-эстэтычных поглядаў Ф.Багушэвіча. Грамадска-публіцыстычная дзейнасць пісьменніка ў Вільні. Сяброўства з Э.Ажэшка і Я.Карловічам. Зборнік “Дудка беларуская” (1892). Патрыятычная накіраванасць “Прадмовы”. Праблема мастака і народа (“Мая дудка”). Матывы сацыяльнага пратэсту (“Дурны мужык як варона”, “Бог не роўна дзеле”, “Думка” і інш.). Выкрыццё царскага суда і чыноўніцтва (“У астрозе”, “У судзе”, “Як праўды шукаюць”). Жанры балады (“Быў у чыстцы”, “Балада”), вершаванага апавядання і аповесці (“Хрэсьбіны Мацюка”, “Кепска будзе”). Асаблівасці рэалізму Ф.Багушэвіча. Зборнік “Смык беларускі” (1894). Маральна-этычны і філасофскі змест цыкла “Песні”, своеасаблівасць яго паэтычнай будовы. Байкі Ф.Багушэвіча (“Воўк і авечка”, “Свіння і жалуды”).

Ф.Багушэвіч як адзін з заснавальнікаў беларускай прозы (“Сведка”, “Палясоўшчык”, “Дзядзіна”, “Тралялёначка”).

## Тэма 7. Нашаніўскі перыяд у гісторыі беларускай літаратуры

Грамадска-палітычныя і сацыяльна-гістарычныя ўмовы развіцця беларускай літаратуры пачатку XX ст. Удзел пісьменнікаў (Цётка, Я.Купала, Я.Колас, М.Багдановіч, А.Гарун, В.Ластоўскі, М.Гарэцкі, З.Бядуля і інш.) у грамадска-культурным руху пачатку XX ст. Газеты “Наша доля” і “Наша ніва”, кансалідацыя творчых сіл на платформе “нашаніўства”. “Паскоранасць” літаратурнага працэсу. Развіццё лірычнай паэзіі, зараджэнне нацыянальнага ліра-эпасу, станаўленне прозы і драматургіі, крытыкі і публіцыстыкі, перакладчыцкай справы. Жанрава-стылявое ўзбагачэнне літаратуры. Сацыяльна-палітычныя абставіны ў Беларусі ў 1917–1920 гг. Палітыка беларусізацыі і яе складаны шлях. Заснаванне Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1922), Інстытута беларускай куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туры (Інбелкульт) (1922), Акадэміі навук БССР (1929), адкрыццё БДТ-1 і БДТ-2 (тэатры Я.Купалы і Я.Коласа, 1920), Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі (1924) і інш. Значэнне гэтых падзей для развіцця беларускай літаратуры і культуры.

## Тэма 8. Цётка (1876–1916)

Цётка (Алаіза Пашкевіч). Наватарства паэтычных вобразаў і ідэй у творах перыяду першай рускай рэвалюцыі (“Хрэст на свабоду”, “Мора”, “Вера беларуса”, “Суседзям у няволі” і інш.). Цётка як заснавальніца публіцыстычных жанраў у беларускай паэзіі пачатку XX ст. (маштабнасць вобразаў, экспрэсіўнасць). Гуманістычная скіраванасць і псіхалагізм прозы і публіцыстыкі Цёткі (“Прысяга над крывавымі разорамі”, “Асеннія лісты”, “Міхаська”, “Зваротлівы” і інш.).Цётка і развіццё народнай асветы і культуры.

## Тэма 9. Максім Багдановіч (1891–1917)

Роля сям’і ў фарміраванні светапогляду і творчых зацікаўленасцей паэта. Эстэтычныя погляды М.Багдановіча (“Музыка”, “Апокрыф”, “Песняру”, “Псалтыр”). Зборнік “Вянок” (1913). Міфалагічныя і народнапесенныя тэмы і матывы. Праблема гістарычнай памяці народа, гуманістычны і патрыятычны пафас лірыкі паэта (“Пагоня”, “Беларусь, твой народ дачакаецца”, “Дось ужо чужынцам служылі”, “Як Базыль у паходзе канаў”). Героіка-рамантычныя паэмы “Максім і Магдалена” (1915) і “Страцім-лебедзь” (1916). Праблематыка, сістэма паэтычнай вобразнасці, народнапесенная стылістыка. М.Багдановіч як стылізатар беларускага верша (“Вершы беларускага складу”, цыкл “На ціхім Дунаі”). Абгрунтаванне перспектыўнасці творчай канцэпцыі паэта (арт. “Забыты шлях”, 1915). Перакладчыцкая дзейнасць. М.Багдановіч як крытык і гісторык літаратуры. Вобраз М.Багдановіча ў беларускім мастацтве, музыцы, кіно.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 10. Янка Купала (1882–1942)

Янка Купала (Іван Луцэвіч). Ранні перыяд творчасці. Зборнікі: "Жалейка", "Гусляр". Літаратурна-творчая і грамадская дзейнасць Я.Купалы ў гады грамадзянскай вайны і акупацыі Беларусі (1917–1920). Зборнік "Спадчына". Яго праблематыка, агульны пафас. Сацыяльна-філасофская, нацыянальна-патрыятычная, інтымная, пейзажная лірыка Я.Купалы. Асаблівасці твораў канца 20 – пачатку 30-х гг. ("Сыходзіш, вёска, з яснай явы", "Дзе крыўда адвечная спела" і інш.). Паэмы Я.Купалы ("Адвечнае", "Зімою", "На куццю", "Адплата кахання", "Нікому", "Яна і я", "Тарасова доля"). Тэма Бацькаўшчыны ў паэмах "Адвечная песня", "Сон на кургане", "Безназоўнае". Драматургія Я.Купалы. "Прымакі", "Паўлінка", "Раскіданае гняздо", п'еса "Тутэйшыя" – канцэпцыя "тутэйшасці". Перакладчыцкая дзейнасць. Роля Я.Купалы – прарока нацыі – у гісторыі беларускай літаратуры, музыкі, тэатра, мастацтва. Спадчына Купалы ў асвятленні сучасных крытыкаў, літаратуразнаўцаў і культуролагаў.

## Тэма 11. Якуб Колас (1882–1956)

Якуб Колас (Канстанцін Міцкевіч). Ранні перыяд творчасці. Зборнік "Песні жальбы". Асэнсаванне Я.Коласам падзей вайны і рэвалюцыі. Зборнік "Казкі жыцця", яго маральна-этычная і філасофская накіраванасць, сувязь з гістарычным лёсам беларускага народа ("Проціў вады", "Крыніца", "Гусі" і інш.). Паглыбленне грамадзянскіх матываў у зб. "Водгулле" (1922). Праблематыка ранніх апавяданняў пачатку 20-х гадоў ("Сяргей Карага", "Крывавы вір", "Дачакаўся"), іх навізна і актуальнасць, прыёмы псіхалагічнага раскрыцця вобразаў. Творчая праца Я.Коласа над паэмамі "Новая зямля" (1923) і "Сымон-музыка" (1925). Роля сатыры і гумару, арыгінальнасць рытміка-інтанацыйнай структуры. Трылогія "На ростанях" ("У палескай глушы", 1922; "У глыбі Палесся", 1927; "На ростанях",1954). Біяграфічная падаснова рамана і яе ўплыў на вобразную структуру твора. Інтэлігенцыя і народ ў рамане. Рэгіянальны сацыяльна-псіхалагічны і этнаграфічна-бытавы каларыт у рамане.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 12. Максім Гарэцкі (1893–1938)

Трагізм жыццёвага лёсу. Характарыстыка асноўных этапаў творчасці. М.Гарэцкі як прадстаўнік інтэлектуальна-філасофскай прозы. Заглыбленне ў сутнасць нацыянальнага менталітэту, пошукі "патаёмнага" як спроба нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Тэма інтэлігенцыі і народа ў ранніх творах "Роднае карэнне", "У лазні", "Што яно?". Распрацоўка гістарычнай тэматыкі: цыкл апавяданняў "Лірныя спевы". Драматызаваная аповесць "Антон" (1914). Жанравая адметнасць і маральна-філасофскі змест твора. Наватарства Гарэцкага ў выкарыстанні дакументалізму, спалучэнні структурных і стылявых пачаткаў эпасу і драмы. Ідэйная сутнасць сцэны "У славянскай кафейні". Палемічная завостранасць вобразаў твора. Перыяд вайны і рэвалюцыі (1914–1918). "Літоўскі хутарок", "Генерал" і інш. Гуманістычны пафас і паглыбленне аб'ектывізаванай манеры пісьма. Уключанасць твораў М.Гарэцкага ў сусветную плынь літаратуры страчанага пакалення (Э.М.Рэмарк, Э.Хэмінгуэй, А.Барбюс і інш). Дакументальна-мастацкія запіскі "На імперыялістычнай вайне". Сінтэз агульначалавечага і нацыянальнага ў творы. Віленскі перыяд творчасці празаіка, аповесць "Дзве душы" (1919). Шматузроўневасць твора, яго жанравая спецыфіка: спалучэнне рэалізму і элементаў дэтэктыву, публіцыстычнасці і дакументалізму. Аповесці "Меланхолія", "Ціхая плынь". Праўдзівасць, мастацкая дасканаласць. Творчая гісторыя рамана-хронікі "Віленскія камунары". Маштабнасць задумы эпапеі пра лёс сялянства ў XIX і XX стст. у аповесці "Камароўская хроніка".

## Тэма 13. Кандрат Крапіва (1896–1991)

Кандрат Крапіва (Кандрат Атраховіч). Удзел у літаратурных арганізацыях "Маладняк", "Узвышша". Тэматычны дыяпазон сатырычна-гумарыстычных вершаў і баек ранняга перыяду творчасці. К.Крапіва – празаік. Зборнік апавяданняў "Людзі-суседзі". Раман "Мядзведзічы". Гуманістычна-сатырычная аснова прозы К.Крапівы. Першая п'еса "Канец дружбы" (1934). Псіхалагізм твора, схематызм канфлікту. Камедыя "Хто смяецца апошнім?" у тэатральнай культуры Белару-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сі. Творчасць К.Крапівы ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Праблематыка п’есы “Мілы чалавек” (1945). Сацыяльна-філасофская драма “Брама неўміручасці” (1973). Ідэйны змест і жанравыя асаблівасці. Роля К.Крапівы ў развіцці нацыянальнай драматургіі.

## Тэма 14. Кузьма Чорны (1900–1944)

Кузьма Чорны (Мікалай Раманоўскі). Характарыстыка апавяданняў са зборнікаў “Апавяданні”, “Срэбра жыцця” (1925), “Па дарозе”, “Хвоі гавораць”, “Пачуцці”(1926), “Вераснёвыя ночы” (1929). К.Чорны – раманіст. Раман “Зямля” (1927). Праблема інтэлігенцыі і народа ў рамане “Сястра” (1928). Гуманістычны пафас твора. Сацыяльна-гістарычная аснова рамана “Бацькаўшчына”, шматграннасць праблематыкі. Эпічныя творы К.Чорнага ваеннага часу: раманы “Пошукі будучыні”, “Млечны шлях”, “Вялікі дзень” і аповесць “Скіп’ёўскі лес”. Традыцыі сацыяльна-філасофскай прозы К.Чорнага ў развіцці сучаснай беларускай літаратуры.

## Тэма 15. Максім Танк (1912–1995)

Максім Танк (Яўген Скурко). Удзел у нацыянальна-вызваленчай барацьбе Заходняй Беларусі. Першы зборнік паэзіі “На этапах” (1936) і яго мастацкія асаблівасці. Пашырэнне ідэйна-тэматычнага дыяпазону паэта ў зборніках “Журавінавы цвет”, “Пад мачтай”. Эстэтычныя пошукі ў давераснёўскай творчасці М.Танка (паэмы “Кастусь Каліноўскі”, “Нарач”, “Сказ пра Вяля”, “Казка пра музыку”). Паэзія М.Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Характарыстыка пасляваенных зборнікаў “Каб ведалі”, “На камні, жалезе і золаце”, “У дарозе”. Паэма “Люцыян Тапаля”. Праблема народнасці мастацтва. Паглыбленне гуманістычных тэндэнцый і філасафічнасці ў зборніках “След бліскавіцы”, “Мой хлеб надзённы”, “Глыток вады”, “Перапіска з зямлёй”, “Хай будзе святло”, “Дарога, закалыханая жытам”, “Нарачанскія сосны”. Лірычнае і публіцыстычнае ў паэзіі М.Танка 80–90-х гг. ХХ стагоддзя (зборнікі “Лірыка”, “Мой каўчэг”, “Errata”). Майстэрства М.Танка – перакладчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 16. Аркадзь Куляшоў (1914–1978)

Першыя зборнікі “Росквіт зямлі”, “Медзі дождж”, “Па песню, па сонца”. Цыклы вершаў “Сонечнае заўтра” і “Юнацкі свет”. Паэмы А.Куляшова даваеннага часу (1931–1940 гг.): “Крыўда”, “Гарбун” (“Антон Шандыбала”), “У зялёнай дуброве”, “Хлопцы апошняй вайны” і інш. Іх грамадзянска-патрыятычная накіраванасць. Вершы і балады перыяду вайны. Паэмы “Сцяг брыгады”, “Прыгоды цымбал” і інш. Пашырэнне гуманістычнага пафасу ў філасофскай лірыцы А.Куляшова канца 50–60-х гг. (“Новая кніга”). Традыцыйны характар цыкла вершаў “Маналог”. Паглыбленне філасофскіх і інтэлектуальных пачаткаў у паэмах “Цунамі” і “Далёка да акіяна”. Лірыка-маналагічны стыль паэмы “Варшаўскі шлях”. Тэматычная і жанравая навізна драматычнай паэмы “Хамуціус”. Вобраз Кастуся Каліноўскага.

## Тэма 17. Пімен Панчанка (1917–1995)

Матывы ранняй лірыкі зборнік “Упэўненасць”, 1938. Паэзія П.Панчанкі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Вобраз лірычнага героя. Аўтабіяграфізм твораў П.Панчанкі. Гісторыя напісання цыкла вершаў “Іранскі дзённік”. Творчасць П.Панчанкі першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Паглыбленне эстэтычных і сацыяльна-філасофскіх асноў лірыкі паэта, увага да маральна-этычных праблем часу (зборнік “Кніга вандраванняў і любові”). Публіцыстычна-сатырычная скіраванасць творчасці паэта ў другой палове 50-х–60-я гг. Зборнік “Пры святле маланак” (1966) – этапная кніга П.Панчанкі. Шырокі ахоп з’яў рэчаіснасці, глыбокі філасофскі роздум і жанравая разнастайнасць лірыкі паэта (зборнікі “Крык сойкі”, 1976, “Дзе начуе жаўранак”, 1983, “Неспакой”, 1988, “Мы з тых беларусаў”, 1990, “Выбранае”, 1993). Засяроджанасць паэзіі П.Панчанкі 80–90-х гг. на духоўных каштоўнасцях чалавечага жыцця. Гуманістычны пафас і спавядальныя матывы ў зборніку “І вера, і вернасць, і вечнасць…” Значэнне наватарскіх пошукаў П.Панчанкі ў галіне рытмікі і стылістыкі верша і яго жыццёвай пазіцыі ў гісторыі беларускай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 18. Іван Мележ (1921–1976)

Першы зборнік прозы “У завіруху” (1946). Аповесць “Гарачы жнівень” (1946) – страты і здабыткі. Атмасфера жыцця даваеннай беларускай вёскі. Паказ падпольнай і партызанскай барацьбы ў гады Айчыннай вайны ў рамане “Мінскі напрамак” (1947–1952). Пошукі новых тэм і герояў у першай палове 50-х гг. Праблемы маралі, духоўнасці чалавека (апавяданні “Дом пад сонцам”, “Спатканне за горадам”, “У гарах дажджы” і інш). П’есы “Пакуль маладыя” (1955), “Дні нараджэння” (1957). “Палеская хроніка” І.Мележа: раманы “Людзі на балоце” (1960), “Подых навальніцы” (1965), “Завеі, снежань” (1976). Тэматыка і праблематыка. Шматпланавае эпічнае адлюстраванне жыцця беларускай вёскі 20-х гг., лёсу народа ў пераломны перыяд гісторыі, стварэнне яркіх індывідуальных характараў. Кніга артыкулаў і публіцыстычных выступленняў І.Мележа “Жыццёвыя клопаты” (1975).

## Тэма 19. Янка Брыль (1917–2006)

Адлюстраванне заходнебеларускай рэчаіснасці ў ранніх творах (“Марыля”, “Праведнікі і зладзеі”, “Сірочы хлеб” і інш). Майстэрства Брыля-апавядальніка. Маральна-этычная праблематыка апавяданняў “Галя”, “Адзін дзень”, “Казачок”. Аповесць “Апошняя сустрэча” – паглыбленне псіхалагізму і аналітычнасці. Раман Я.Брыля “Птушкі і гнёзды”. Гісторыя стварэння, аўтабіяграфічныя элементы. Тэма Бацькаўшчыны. Вобраз Алеся Руневіча. Навізна праблематыкі. Мастацка-выяўленчыя сродкі твора. Аналітычнасць, лірызм і філасафічнасць твора. Аповесць “Ніжнія Байдуны”: разнавіднасці смеху і іх адлюстраванне ў творы. Выяўленчае майстэрства пісьменніка ў аповесці “Золак, убачаны здалёк”. Жанр міні-прозы ў творчасці Я.Брыля, яго сувязь з дзённікавымі запісамі. Сродкі стварэння мастацкага вобраза ў “малой прозе”. Тэматычная разнастайнасць і эстэтычная арыгінальнасць мініяцюр з кніг “Жменя сонечных промняў”, “Вітраж”, “На сцежцы дзеці” і інш. Трагізм чалавечага лёсу ў аповесці “Муштук і папка”. Аўтабіяграфічная аснова твора.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэма 20. Васіль Быкаў (1924-2003)

Асуджэнне вайны ў ранніх апавяданнях "У той дзень", "Смерць чалавека", "Абознік", "Загад", "Незагойная рана". Гістарычна праўдзівае адлюстраванне падзей і духоўнага вобліку радавога ўдзельніка вайны ў аповесцях "Жураўліны крык" (1959), "Здрада" (1960), "Трэцяя ракета" (1961). Паэтызацыя подзвігу ў аповесці "Альпійская балада" (1963). Мастацкія пошукі В.Быкава ў другой палове 60-х гг. Аповесці "Мёртвым не баліць", "Праклятая вышыня", "Круглянскі мост". Цікавасць В.Быкава да партызанскай і падпольнай барацьбы: "Сотнікаў", "Абеліск" (1971), "Воўчая зграя" (1974), "Знак бяды" (1982), "Кар'ер" (1986) і інш. Мастацка-філасофскае асэнсаванне разбурэння асноў народнага жыцця ў аповесцях "Аблава", "Сцюжа". Айчынная гісторыя ў апавяданнях "На чырвоных лядах", "Перад канцом", "Жоўты пясочак", "Чырвоныя пятліцы". Тэматычная навізна твораў, прысвечаных вайне ("Пакахай мяне, салдацік", "Балота", "Палкаводзец", "Палітрук Каламіец", "Кацюша", "Пагорак" і інш.). Адлюстраванне праблем сучаснасці ("Ваўчыная яма"). Прытчы і прыпавесці В.Быкава ("Ідэя", "Труба", "Камень", "Свіст", "Тры словы нямога", "Кошка і мышка" і інш.). Кнігі апавяданняў "Сцяна" (1997), успамінаў "Доўгая дарога дадому" і публіцыстыкі "Крыжовы шлях". Традыцыі і наватарства ў творчасці В.Быкава. Крытычныя і літаратуразнаўчыя працы пра жыццё і творчасць пісьменніка. Экранізацыя твораў ("Жураўліны крык", "Здрада", "Трэцяя ракета", "Пастка", "Альпійская балада", "Праклятая вышыня", "Сотнікаў", "Абеліск", "Дажыць да світання", "Воўчая зграя", "Знак бяды"). Роля В.Быкава ў духоўна-маральным жыцці грамадства.

## Тэма 21. Іван Шамякін (1921–2004)

Раннія творы на тэму Вялікай Айчыннай вайны (апавяданне "У снежнай пустыні", аповесць "Помста"). Раманы "Глыбокая плынь", "У добры час", "Крыніцы", іх змест і праблематыка. Пенталогія "Трывожнае шчасце" – твор пра пакаленне равеснікаў пісьменніка. Раманы "Сэрца на далоні", "Атланты і карыятыды". Ідэйны змест і праблематыка. Тэматыка

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

і мастацкія асаблівасці драматычных твораў “Не верце цішыні”, “Выгнанне блудніцы”, “Дзеці аднаго дома”, “І змоўклі птушкі”. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творах “Шлюбная ноч”, “Гандлярка і паэт”. Маральна-этычная праблема ў раманах “Вазьму твой боль”, “Зеніт”. Гістарычныя раманы “Петраград – Брэст”, “Вялікая княгіня”. Праблемы сучаснасці ў творах “Злая зорка”, “Сатанінскі тур”, “Губернатар”.

## Тэма 22. Уладзімір Караткевіч (1930–1994)

Рознабаковасць таленту (паэзія, проза, драматургія, эсэістыка). Зборнікі паэзіі “Матчына душа”, “Вячэрнія ветразі”, “Мая Іліяда”, “Быў. Ёсць. Буду”. У.Караткевіч – празаік. Гістарычнае мінулае і сучаснасць у раманах “Нельга забыць”, “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, “Чорны замак Альшанскі”, аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха”. Разнастайнасць характараў, драматызм адносін, прыгодніцка-рамантычная аснова ў творах. Раман “Каласы пад сярпом тваім” – шматпланавае палатно пра падрыхтоўку паўстання 1863 года ў Беларусі. Выкрывальніцкі пафас аповесці “Зброя”. Паэма ў прозе “Чазенія”. Філасофская праблематыка аповесці “Ладдзя роспачы”. Майстэрства У.Караткевіча – апавядальніка (“Вока тайфуна”, “Кніганошы”, “Краіна цыганія” і інш). Патрыятычны пафас нарысаў-эсэ пісьменніка (“Зямля пад белымі крыламі”, “Белавежская пушча”). У.Караткевіч – драматург (“Званы Віцебска”, “Маці Урагану”, “Кастусь Каліноўскі”, “Млын на Сініх Вірах”, “Калыска чатырох чараўніц”). Роля У.Караткевіча ў гісторыі беларускай літаратуры.

## Тэма 23. Беларуская “ваенна-вясковая” школа ў прозе

Іван Чыгрынаў (1934–1996). І.Чыгрынаў – апавядальнік. Пенталогія: раманы “Плач перапёлкі”, “Апраўданне крыві”, “Свае і чужынцы”, “Вяртанне да віны”, “Не ўсе мы згінем”. Праблематыка, вобразы твораў. Ідэйна-мастацкая і грамадзянская эвалюцыя светапогляду пісьменніка ў заключных раманах пенталогіі. Вячаслаў Адамчык (1933–2001). Празаічная тэтралогія (“Чужая бацькаўшчына”, “Год нулявы”, “І скажа той, хто народзіцца”, “Голас крыві брата твайго”). Нацыя-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нальнае і сацыяльнае, традыцыі і наватарства, жанрава-стылістычныя і вобразна-выяўленчыя асаблівасці прозы В.Адамчыка. Анатоль Кудравец (нар. 1936). Аповесць "Раданіца", раман "Сачыненне на вольную тэму". Псіхалагізм у паказе жыцця беларускай вёскі. Навізна праблематыкі апавяданняў 90-х гг. ("Ігнат Сцяпанавіч Вапшчэткі", "Баёк", "Бацька" і інш.).

## Тэма 24. Традыцыі і наватарства ў сучаснай прозе

Віктар Казько (нар. у 1940). Аповесць "Суд у Слабадзе", раманы "Неруш", "Хроніка дзетдомаўскага саду", аповесці "Выратуй і памілуй нас, Чорны бусел", "Бунт незапатрабаванага праху": праблематыка, жанрава-стылістычныя асаблівасці. Проза В.Казько і традыцыі еўрапейскай літаратуры. Міхась Стральцоў (1937–1987). Разнаплананавасць творчых зацікаўленасцей. Зборнікі прозы "Блакітны вецер", "Сена на асфальце". Стылёвая адметнасць, імпрэсіяністычнасць творчай манеры. Паэтычныя кнігі "Ядлоўцавы куст", "Цень ад вясла", "Мой свеце ясны". Традыцыі і наватарства ў творчасці пісьменніка. Іван Пташнікаў (нар. у 1932). Аповесці "Тартак", "Найдорф", раман "Алімпіяда". Малюнкава-аналітычны прынцып адлюстравання рэчаіснасці, паяднанне вопыту нацыянальнай і сусветнай прозы.

## Тэма 25. "Філалагічнае пакаленне"

Ніл Гілевіч (нар. у 1931). Паэтычныя зборнікі: "Актавы", "Жыта, сосны і валуны", "Талісман", "Ёсць зямля такая". Грамадзянскі пафас, бескампраміснасць, мяккі лірызм, жанравая разанстайнасць твораў. Раман у вершах "Родныя дзеці". Паэмы: "Сто вузлоў памяці", "А дзе ж тая крынічанька", "Лодачкі". Рыгор Барадулін (нар. у 1935). Зборнікі паэзіі: "Нагбом", "Неруш", "Свята пчалы", "Евангелле ад мамы", "Самота паломніцтва", "Ксты". Адметнасць барадулінскага метафарызму. Майстэрства Р.Барадуліна-перакладчыка. Васіль Зуёнак (нар. у 1935). Асноўныя матывы лірыкі. Паэмы "Сяліба", "Маўчанне травы", "Падарожжа вакол двара". Мастацкае даследаванне быцця і маралі народа. Касмізм і гуманістычная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сутнасць мыслення. Анатоль Вярцінскі (нар. у 1931). Гуманістычны пафас і грамадзянскае гучанне лірыкі. Зборнікі “Тры цішыні”, “Чалавечы знак”, “Жанчына. Мужчына. Каханне” і інш. Своеасаблівасць паэтычнай манеры. Паэмы “Дажынкі”, “Заазер’е”, “Колькі лет, колькі зім”. Праблематыка і асаблівасці вобразна-выяўленчай палітры. Янка Сіпакоў (нар. у 1936). Кніга “Веча славянскіх балад” і яе значэнне ў гісторыі беларускай літаратуры. Паэма “Одзіум”: вобразна-выяўленчыя сродкі, праблематыка. Жанрава-стылёвая адметнасць прозы Я.Сіпакова. Кнігі “Жанчына сярод мужчын”, “Тыя, што ідуць” і інш.

## Тэма 26. Паэзія на сучасным этапе

Алесь Разанаў (нар. у 1947). Зборнікі “Каардынаты быцця”, “Шлях – 360”, “У горадзе валадарыць Рагвалод”, “Рэчаіснасць” і інш. Інтэлектуальная насычанасць. Узбагачэнне беларускай паэзіі новымі жанравымі формамі (квантэмы, вершаказы, версэты). Паэзія як спосаб самапазнання, зашыфраванасць і метафарычнасць вобразаў. Яўгенія Янішчыц (1948–1988). Адметнасць паэтычных зборнікаў “Снежныя грамніцы”, “Дзень вечаровы”, “Ясельда”, “На беразе пляча”, “Каліна зімы”. Асаблівасці інтымнай лірыкі: эмацыянальнасць, задушэўнасць.

## Тэма 27. Драматургія

Сцэнічны поспех п’ес А.Макаёнка. Надзённасць п’ес М.Матукоўскага (“Амністыя”, “Апошняя інстанцыя), І.Козела (“Папараць-кветка”, “Над хвалямі Серабранкі”). Алесь Петрашкевіч (нар. у 1930). Маральна-этычная праблематыка п’ес “Трывога”, “Соль”, “Злыдзень”, “Укралі кодэкс”. Зварот да гісторыі на пачатку 80–90-х гг. XX ст. “Напісанае застаецца”, “Змова”, “Мой друг – Вялікі Чалавек”. Чарнобыльская тэматыка (“Дагарэла свечачка”, “Інтэрнацыянал па-беларуску”). А.Дудараў (нар. у 1950). П’еса “Радавыя”: паказ вайны вачыма паваеннага пакалення. Беларуская гісторыя ў п’есах “Купала”, “Чорная панна Нясвіжа”. Пошук новых жанравых форм, арыентацыя на творчы эксперымент. Шляхі абнаўлен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня паэтыкі ў драматургіі “новай хвалі”. Герменеўтычная драматургія С.Кавалёва (п’есы “Стомлены д’ябал”, “Тарас на Парнасе”).

## Тэма 28. Сучасны літаратурны працэс

Агульная характарыстыка сацыяльна-грамадскіх абставін. Узнікненне літаратурных суполак “Тутэйшыя”, “ТВЛ”, “Бум-Бам-Літ”, “Шмэрцвэрк” і інш., новых літаратурна-філасофскіх выданняў “Крыніца”, “Зно”, “Дзеяслоў”, “Arche”, аднаўленне “Нашай нівы”. Філасофска-эстэтычная эвалюцыя прозы 90-х – пачатку XXI ст. Тэматычныя і жанрава-стылёвыя кірункі. Пашырэнне жанравых форм, жанравая інтэграцыя. Тэндэнцыі постмадэрнізму і іх выяўленне ў творчасці Ю.Станкевіча (“Любіць ноч – права пацукоў”, “Бесапатам”), В.Гігевіча (“Пабакі”, “Карабель”, “Прыгоды Базыля Беларуса”), А.Федарэнкі (“Нічые”, “Рэвізія”), А.Наварыча (“Прыгоды Рабунькі”, “Літоўскі воўк”).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

1. *Лойка, А.А.* Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя: некаторыя заканамернасці і асаблівасці / А.А.Лойка. – Мн.: БДУ, 1972. – 238 с.

2. *Семяновіч, А. А.* Гісторыя беларускай драматургіі XIX – пач. XX ст.: вучэб. дапам. для студэнтаў філал. факультэтаў педагагічных інстытутаў / А.А.Семяновіч. – Мн.: Вышэйш. шк., 1985. – 165 с.

3. *Хрэстаматыя* па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі: у 3 т. / Бел. ун-т культуры. – Мн.: Бел. навука, 1997. – Т. 1; 1998. – Т. 2; 2000. – Т. 3.

4. *Гісторыя* беларускай літаратуры: старажыт. перыяд: падруч. для філал. спецыяльнасцей пед. ВНУ / М.М.Грынчык, У.А.Калеснік, У.Г.Кароткі [і інш.]. – 4-е выд., стэрэатып. – Мн.: Вышэйш. шк., 1998. – 349 с.

5. *Гісторыя* беларускай літаратуры XIX – пач. XX стст.: падруч. для філал. спецыяльнасцей вышэйш. пед. навуч. устаноў / І.Э.Багдановіч, У.В.Гніламёдаў, Л.С.Голубева [і інш.]. – 2-е выд., дапрац. – Мн.: Вышэйш. шк., 1998. – 559 с.

6. *Гніламёдаў, У.В.* Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра бел. паэзію / У.В.Гніламёдаў. – Мн.: Маст. літ., 2001. – 244 с.

7. *Гісторыя* беларускай літаратуры: XX стагоддзе (20–50-я гг.): падруч. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей ВНУ / У.В.Гніламёдаў, В.В.Казлова, М.А.Лазарук [і інш.]. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мн.: Вышэйш. шк., 2000. – 510 с.

8. *Васючэнка, П.В.* Сучасная беларуская драматургія: дапам. для настаўнікаў / П.В.Васючэнка. – Мн.: Маст. літ., 2000. – 156 с.

9. *Бельскі, А.І.* Беларуская літаратура XX стагоддзя: гісторыя і сучаснасць / А.І.Бельскі. – Мн.: Аверсэв, 2005. – 270 с.

10. *Баршчэўскі, Л.* Беларуская літаратура і свет: ад эпохі рамантызму да нашых дзён: папулярныя нарысы / Лявон Баршчэўскі, Пятро Васючэнка, Міхась Тычына. – Мн.: Радыёла–плюс, 2006. – 574с.

11. *Гісторыя* беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў: у 2 т. – 2-е выд. – Мн.: Бел. навука, 2007.

12. *Беларуская* літаратура XX стагоддзя (біяграфіі, бібліяграфія, літаратурная крытыка): даведнік для старэйшага школьнага ўзросту / Д.Я.Бугаёў [і інш.]. – Мн.: Паркус плюс, 2008. – 308 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА**

*Праграма да дзяржаўных экзаменаў па спецыяльнасці*
*23 01 11 бібліятэказнаўства і бібліяграфія спецыялізацыя*
*23 01 11 – 04 01 беларуская мова і літаратура*

Рэдактар В.М.Сакалова
Камп'ютэрная вёрстка А.У.Гіцкая

Падпісана ў друк 2009 г. Фармат 60x84 $^{1}/_{16.}$
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,85. Ул.-выд. арк. 1,22.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў.
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ